

НОВАЯ ПАДБОРКА ЦІКАВЫХ ГІСТОРЫЙ
13

НА ВЫХАДНЫХ — МОКРЫ СНЕГ І ГАЛАЛЁДЗІЦА
16



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

27 КАСТРЫЧНІКА 2023 г. ПЯТНІЦА № 209 (30089)

## КОРАТКА

● **Наталля Качанава правяла нараду па пытаннях стварэння інавацыйных вытворчасцяў у Мінску.**

● З 1 лістапада 2023 года змяняюцца памеры бюджэту пражытачнага мінімуму, а таксама павялічваюцца памеры сацыяльных пенсій інвалідам і дзецям-інвалідам, «узроставыя» даплаты да пенсій і памеры дзяржаўнай дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей.

● **Заснаваны нацыянальны чэмпіянат сярод жаночых каманд па хакеі.**

● «Белавія» запускае чартарныя рэйсы з Гомеля ў Шарм-эль-Шэйх.

● **Ваенная акадэмія правядзе 28 кастрычніка дзень адкрытых дзвярэй.**

● Праект па выкарыстанні нейронавых сетак у дыягностыцы рэалізуюць у Гродзенскай універсітэцкай клініцы.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей АЛЕЙНІК, міністр замежных спраў:**

*«Заходнецэнтрычнасць адыходзіць у мінулае. Гэта месца займае шматпалярнасць, поліцэнтрычнасць. Большасць краін свету выступаюць за разнастайнасць шляхоў развіцця і хочуць, каб іх выбар паважалі, а не насаджалі ім чужыя прынцыпы. І ў гэтым працэсе ключавое месца займае Еўразія. Калі атрымаецца аб'яднаць тых, хто разумее, што будучыня менавіта за еўразійскай узаемазвязанасцю, якая базіруецца на адзінай сістэме бяспекі, устойлівых эканамічных сувязях, энергетычных і транспартна-лагістычных калідорах, то ад гэтага выйграюць усе».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# БЕЛАРУСЬ ЗНОЎ ЗАКЛІКАЕ ДА МІРУ







Фота БелТА.

**Гэтымі днямі Мінск праводзіць міжнародную канферэнцыю высокага ўзроўню «Еўразійская бяспека: рэальнасць і перспектывы ў свеце, які трансфармуецца». У дыскусіі на тэму міжнароднай бяспекі бяруць удзел звыш 300 гасцей з 30 краін. Ініцыятыву аб правядзенні канферэнцыі ў лістападзе мінулага года на саміце АДКБ у Ерэване агучыў Аляксандр Лукашэнка.**

**У прывітанні гасцям і ўдзельнікам міжнароднага форуму Прэзідэнт Беларусі адзначыў, што менавіта такі фармат узаемадзеяння і камунікацыі цяпер як ніколі вельмі запатрабаваны і будзе актуальны заўсёды. Беларускі лідар лічыць, што складаную задачу па недапушчэнні войнаў і ўзброеных канфліктаў павінны вырашаць людзі добрай волі ва ўсіх краінах і на ўсіх кантынентах. «Гарантыі спакою і ўстойлівага развіцця ствараюцца нашымі намаганнямі па падтрыманні міру, вырашэнні рознагалоссяў дыпламатычнымі шляхамі, зніжаючы ўзровень супрацьстаяння, варожасці і нянавісці», — адзначаецца ў прывітанні.**

**Тэма міру і бяспекі атрымала свой працяг і ў Палацы Незалежнасці. Аляксандр Лукашэнка правёў дзве рабочыя сустрэчы з удзельнікамі міжнароднай канферэнцыі, кіраўнікамі знешнепалітычных ведамстваў Расійскай Федэрацыі і Венгрыі.**

### «МЫ ДЗЕЙНІЧАЕМ ЯК АДЗІНАЕ ЦЭЛАЕ»

**Аляксандр Лукашэнка выказаў удзячнасць міністру замежных спраў Расіі Сяргею Лаўрову за прыезд у Мінск на міжнародную канферэнцыю высокага ўзроўню па тэме еўразійскай бяспекі. Па меркаванні кіраўніка дзяржавы, вельмі знакава, што прадстаўнікі многіх краін пачуюць пазіцыю Расіі па многіх пытаннях еўрапейскай бяспекі.**

«І Расія, і Беларусь нямала сёння робяць для таго, каб утрымаць не толькі Еўропу, але і свет ад скочвання да самай небяспечнай рысы, — падкрэсліў беларускі лідар. — Вы павінны ведаць, што мы і далей будзем прытрымлівацца гэтай лініі. Мы — надзейныя саюзнікі Расійскай Федэрацыі. Вы ў гэтым таксама можаце не сумнявацца. Ніякай тут гульні быць не можа, паколькі мы разумеем, што на карту пастаўлена вельмі шмат. І ў прынцыпе вызывалась нашых дзяржаў і нашых народаў».

Кажучы аб беларуска-расійскіх узаемаадносінах, Прэзідэнт адзначыў, што, нягледзячы на рознага кшталту знешні ціск, краіны рухаюцца ў кірунку рэалізацыі планаў у Саюзнай дзяржаве. «Што датычыцца падмурка — таваразвароту, — вы ведаеце, што ў гэтым годзе мы дасягнём рэкорднага ўзроўню, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Невялікая па памерах Беларусь уваходзіць у пяцёрку па тавараабароце з вялікай, гіганцкай Расіяй. Таксама шмат аб чым гаворыць».

СТАР. 2

Актуальна

# Ад прагнозаў да рэалізацыі

### Эксперты назвалі сем прыярытэтаў навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці

**Учора ў Нацыянальным прэс-цэнтры адбылася прэс-канферэнцыя, прысвечаная комплекснаму прагнозу навукова-тэхнічнага прагрэсу Беларусі на 2026—2030 гады і на перыяд да 2045 года. На пытанні журналістаў адказвалі старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Сяргей Шлычкоў і дырэктар Беларускага інстытута сістэмнага аналізу і інфармацыйнага забеспячэння навукова-тэхнічнай сферы Наталля Паўлава.**

Трэба адразу адзначыць, што гэтае мерапрыемства — лагічны працяг нарады, якую правёў Прэзідэнт 20 кастрычніка і якая прысвячалася пытанням удасканалення сістэмы планавання і кантролю за рэалізацыяй стратэгічных праектаў. Падчас нарады Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што такія праекты — будучыня нашай краіны, асабліва сёння, калі адбываецца шокавая перанастройка ў сусветных палітычных, эканамічных, фінансавых адносінах. Разам з тым Прэзідэнт засяродзіў увагу ўдзельнікаў нарады на недастатковай рэалізацыі праектаў у рэальным сектары эканомікі. Але ж эканамічны эфект — галоўная мэта ўсіх праектаў. Таму над гэтым трэба працаваць, устараняць недахопы, якія зараз існуюць.

СТАР. 3

Шануем традыцыі

# ВОПЫТ, МУДРАСЦЬ + МАЛАДОСЦЬ

**Камсамольскі задор можна захоўваць і ў 60—80 гадоў, а «пенсіянерам» адчуваць сябе ў душы ўжо ў 25. Да такой высновы прыйшлі ўдзельнікі «Дыялогу пакаленняў», які прайшоў у Рэспубліканскім доме моладзі напярэдадні святкавання 105-годдзя з дня стварэння Усесаюзнага ленінскага камуністычнага саюза моладзі. За сталом у легендарнай зале Бюро ЦК ЛКСМБ (цяпер — ЦК БРСМ) сабраліся лідары і актыў Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, байцы студэнцкіх атрадаў, удзельнікі маладзёжных атрадаў аховы правапарадку, актывісты валанцёрскага руху, ветэраны камсамола і тыя, хто стаяў каля вытокаў стварэння маладзёжнага руху ў незалежнай Беларусі.**

**Анлайн да галоўнай студыі ў беларускай сталіцы падключыліся рэгіёны. Такім чынам, агулам у актуальнай дыскусіі наконт каштоўнасцяў сучаснай моладзі і захавання гістарычнай спадчыны прынялі ўдзел каля 300 чалавек. Ветэраны камсамольскага руху разам з маладым пакаленнем пагарталі старонкі слаўнай камсамольскай гісторыі.**

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

23209

9 771990 763008

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – СА СТАРЫМ СЯБРАМ!

Ідзе падпіска на I паўгоддзе 2024 года.

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2024 года, у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.



# «Трэба развіваць і паглыбляць тое, што маем»

## Прэзідэнт вызначыў асноўныя кірункі ўзаемадзеяння з Валагодскай вобласцю

**Кіраўнік гэтага расійскага рэгіёна ў Беларусі не ўпершыню. Прэзідэнт нагадаў, што падчас першага візіту Алега Куўшыннікава ў нашу краіну ў 2018 годзе былі намечаны сур'ёзныя планы па развіцці супрацоўніцтва ў многіх галінах. Невыпадкова ў першую чаргу беларускі лідар пацікавіўся, што ўдалося зрабіць за гэты час. Традыцыйна кіраўнік дзяржавы спытаў, ці ёсць праблемы, якія перашкаджаюць эфектыўна працаваць. У ходзе сустрэчы абмеркавалі і далейшыя планы: Аляксандр Лукашэнка заўсёды паўтарае, што нельга спыняцца на дасягнутым, нават пры добрых выніках трэба рухацца далей.**

### «Паглыбляць кааперацыйныя сувязі і захоўваць кантроль»

Як звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы, у святле дамоўленасцяў з Прэзідэнтам Расіі ўрад Беларусі атрымаў гранічна дакладную ўстаноўку — максімальна актыўна адпрацоўваць кааперацыйныя праекты з рэгіёнамі Расіі. «Гэтая дзейнасць ужо дае свой плён, — канкрэтызаваў ён. — Па выніках мінулага года дасягнуты рэкордныя лічбы тавараабароту паміж намі: каля 680 мільёнаў долараў (амаль 140 % да папярэдняга года). Экспарт беларускай прадукцыі вырас практычна ў два разы. Па аб'ёме тавараабароту з Беларуссю ваша вобласць займала 13-е месца ў рэйтынгу расійскіх рэгіёнаў. Пры гэтым сярод імпарцёраў нашай прадукцыі вы знаходзіцеся на 17-й пазіцыі, а ў якасці пастаўшчыка — на 9-й. Гэта вельмі высокія паказчыкі».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што сальда ўзаемнага гандлю пакуль традыцыйна не на нашу карысць. Справа ў тым, што беларускія машынабудаўнічыя прадпрыемствы пастаянна закупляюць вялікія аб'ёмы металапрадукцыі «Поўначсталі». Яшчэ адзін мінус — зніжэнне дынамікі гандлю па выніках васьмі месяцаў бягучага года. Прэзідэнту дакладваюць: гэта адбылося за кошт скарачэння на амаль 8,5 % паставак з Валагодскай вобласці асобных пазіцый металапрадукцыі і мінеральных комплексных угнаенняў з-за цэнавага фактару і ў выніку змянення курса долара.

«Але спісваць гэтую сітуацыю толькі на ваганні валютнага рынку, натуральна, нельга, — перакананы Аляксандр Лукашэнка. — Перш за ўсё патрэбна пашыраць наменклатуру паставак, паглыбляць кааперацыйныя сувязі, захоўваць кантроль на ўзроўні ўрадаў за праектамі, якія ўжо рэалізоўваюцца».

### «Ніякіх паралеляў не павінна быць»

Кіраўнік дзяржавы агучыў некалькі асноўных кірункаў узаемадзеяння Беларусі з Валагодскай вобласцю.

Па-першае, гэта супрацоўніцтва ў прамысловай сферы. Па словах Прэзідэнта, Валагодская вобласць стала для Беларусі важнай апорнай кропкай на паўночным захадзе Расіі па прасоўванні перш за ўсё машынабудаўнічай прадукцыі.

«Сфарміраваны ўласныя структуры таваразправоднай сеткі, функцыянуе зборачная вытворчасць на базе Чарапавецкага ліцейна-механічнага завода, вядзецца работа па пашырэнні лакалізацыі, у прыватнасці, вузлоў і агрэгатаў для трактароў, — удакладніў беларускі лідар. — У вас добра развіта металаапрацоўка — значыць, дакладна ёсць патрэба ў абнаўленні станочнага парка. Але, калі шчыра, у гэтым плане мы топчамся на месцы. Упэўнены, вы гэта разумееце не горш за мяне. Калі ў супрацоўніцтве па лініі БЕЛАЗ — «Поўначсталь» работа адладжана, то для МАЗа рынак Валагодскай вобласці ўяўляе сабой практычны інтарэс па ўсіх напрамках. Але пакуль у нашых вытворцаў не атрымліваецца рэзультатыўна працаваць і ў тэндарах удзельнічаць».

Другі кірунак узаемадзеяння звязаны з дублюючымі вытворчасцямі. «Па некаторых пазіцыях вашай металапрадукцыі ўжо на пачатак 2024 года рана ці позна паўстане пытанне абнаўлення ліцейнай вытворчасці і вытворчасці дадатковых аб'ёмаў чыгуннага і стальнога ліцця, — патлумачыў прычыну ўзаемнай цікавасці Аляксандр Лукашэнка. — Відавочна, што трэба абнаўляць і пашыраць тэхналагічную базу. Ці трэба ствараць паралельныя вытворчасці? Беларускім і расійскім прамыслоўцам можна вызначыцца па мэтазгоднасці стварэння ў Чарапаўцы ці, магчыма, на іншай пляцоўцы новай вытворчасці для выпуску ліцця ў інтарэсах машынабудавання Беларусі, і Расіі ў тым ліку».

Пытанне неадназначнае. Тут, па меркаванні Прэзідэнта, неабходны глыбокі экспертны аналіз. «Ніякіх паралеляў у нас не павінна быць, — падкрэсліў ён. — Калі мы адзіны рынак і імкнёмся да гэтага, значыць, мы павінны выпускаць тое, што выпускаем, і забяспечваць наш агульны рынак. Дакладна так і ў Расіі. Нам сёння не да паралельных вытворчасцяў. Трэба развіваць і паглыбляць тое, што маем».

### «Выйдзем на зусім новы ўзровень узаемадзеяння»

Трэці кірунак супрацоўніцтва паміж Беларуссю і гэтым расійскім рэгіёнам напрамую датычыцца лесанарыхтоўчай тэхнікі. Валагодская вобласць з'яўляецца адным з ключавых лесанарыхтоўчых рэгіёнаў Расіі (нароўні з Архангельскам, Іркуцкам, Краснаярскам). «Рэгіён, на мой погляд, цалкам можа стаць удзельнікам праекта па правядзенні выпрабаванняў новай тэхнікі, — заўважыў Прэзідэнт. — Адзіны вытворца ў Расіі — гэта «АМКАДОР-Анега» (Карэлія). Мы маем намер развіваць у Расіі гэтыя кампетэнцыі, будзем гэта рабіць, але нам дакладна трэба мець пэўную схему кірункаў нашых дзеянняў».

Чацвёрты кірунак узаемадзеяння — рэалізацыя «пад ключ» праектаў на аснове беларускіх тэхналогій у аграпрамысловым комплексе, у вырашэнні амбіцыйных задач па забеспячэнні насельніцтва якаснай пітной вадой.

Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што Беларусь гатова дзяліцца сваім вопытам навуковых распрацовак. «Можна таксама актывізаваць важны кірунак — адукацыю ў аграрнай сферы, — прапанаваў кіраўнік дзяржавы. — Ведаю, што ёсць ініцыятыва Валагодскай малочнагаспадарчай акадэміі па арганізацыі вытворчай практыкі студэнтаў на МТЗ. Гэта правільны праект, трэба аднаўляць падобную работу».

Пяты кірунак кааперацыі звязаны з лесаводствам, кіраваннем ляснымі рэсурсамі і лесааднаўленнем. Дадзены кірунак глыбока прапрацоўваецца беларускім бокам. Але, па меркаванні кіраўніка дзяржавы, у гэтым пытанні не хапае комплекснага падыходу. Таму Аляксандр Лукашэнка прапанаваў распрацаваць канкрэтны план супрацоўніцтва. У сваю чаргу, нашым спецыялістам вельмі цікавы досвед валагодскіх спецыялістаў.

Прэзідэнт падкрэсліў, што Беларусь гатова да партнёрства і ў іншых сферах: у прамысловым будаўніцтве, пастаўках будматэрыялаў, ліфтавага абсталявання і не толькі. Аляксандр Лукашэнка прапанаваў вызначыць у кожным ключавым сектары прамысловасці некалькі флагманскіх беларуска-валагодскіх праектаў — да трох у кожным сегменце: машынабудаванні, металургіі, сельскай гаспадарцы, уключаючы жывёлагадоўлю, раслінаводства і перапрацоўку сельгаспрадукцыі, лесаводстве. Яшчэ адна прапанова, якая прагучала ад беларускага лідара, — абавязкова урады раз на паўгоддзе інфармаваць кіраўніцтва аб выніках сумеснай працы. Пры гэтым Прэзідэнт заўважыў, што кантроль за выкананнем дамоўленасцяў нікуды не сыходзіць, ён становіцца яшчэ больш актуальным.

Вераніка КАНЮТА.

**У тэму**

У размове з журналістамі **губернатар Валагодскай вобласці Алег КУЎШЫННІКАЎ** распавёў, што напярэдадні 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў дэлегацыя расійскага рэгіёна перадала Прэзідэнту імёны 214 беларусаў, пахаваных на валагодскай зямлі. «Кожны помнік, кожную магілу мы захоўваем і ведаем кожнага, хто здабываў нашу Вялікую Перамогу», — адзначыў губернатар.

Кажучы аб узаемадзеянні паміж Беларуссю і Валагодскай вобласцю ў эканамічным плане, губернатар адзначыў: «Мы бачым, што расце тавараабарот. Усе буйныя машынабудаўнічыя прадпрыемствы маюць офісы продажаў і дылерскія цэнтры ў Валагодскай вобласці. Кожны другі трактар на нашых палях і ў лясах Валагодскай вобласці — беларускай вытворчасці. Кожны другі ліфт у шматкватэрных дамах Валагодскай вобласці — беларускай вытворчасці. Мы закупляем у Беларусі блочна-модульныя сістэмы падрыхтоўкі пітной вады. Усё гэта і ёсць той вынік глыбокай кааперацыі нашых эканомік».

Губернатар расказаў і аб новых буйных праектах, якія будуць рэалізоўвацца ў рамках беларуска-валагодскага супрацоўніцтва. «Гэта вытворчасць трактарнай тэхнікі на пляцоўках Чарапавецкага ліцейна-механічнага завода, — удакладніў ён. — Мы разглядаем пытанне павелічэння паставак лесанарыхтоўчай тэхнікі кампаніі «АМКАДОР». Запускаем пілотны праект па вытворчасці чыгуннага ліцця для машынабудаўнічых прадпрыемстваў Расіі і Беларусі і яшчэ шмат праектаў па развіцці турыстычнага абмену. Мноства праектаў, якія мы сёння абмеркавалі з Прэзідэнтам, выносім на сумесную камісію, дзе будзем прымаць пратакольныя рашэнні аб павелічэнні аб'ёмаў вытворчасці сумеснай прадукцыі, павелічэнні турпатоку і паляпшэнні нашага эканамічнага кааперацыйнага ўзаемадзеяння».

# БЕЛАРУСЬ ЗНОЎ ЗАКЛІКАЕ ДА МІРУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па словах кіраўніка дзяржавы, і Беларусь, і Расія забяспечаць свой суверэнітэт. Гэта датычыцца як эканомікі, так і іншых сфер. «Нават там, дзе мы крыху адсталі, спадзеючыся на тое, што будзем сумленна супрацоўнічаць з «прасунутымі» Еўропай і калектыўным Захадам, — дадаў беларускі лідар. — Калі мы дзесьці адсталі, навярстаем. Няшмат часу для гэтага трэба. Мы выпрацавалі пэўныя кірункі і рухаемся. Прыклад таму — мікраэлектроніка і іншыя кірункі».

«Мы дзейнічаем як адзінае цэлае, — кажучы аб беларуска-расійскіх адносінах, удакладніў Аляксандр Лукашэнка. — І будзьце ўпэўнены, што Беларусь будзе прыхільная менавіта гэтаму прынцыпу, як бы ні спрабавалі нас тут звярнуць напярэдадні парламенцкіх выбараў».

Кіраўнік дзяржавы расказаў, што ў лютым у Беларусі адбудзецца адзіны дзень галасавання, падчас якога будуць абраны дэпутаты розных узроўняў. Праз год пасля парламенцкіх выбараў стартуе прэзідэнцкая кампанія. Прэзідэнт ведае, да чаго рыхтуюцца апаненты ўлады, таму канстатуе, што нас чакае няпросты перыяд. «Аднак мы гатовы да любых сцэнарыяў», — акцэнтаваў увагу ён.

У сваю чаргу, Сяргей Лаўроў падзякаваў за запрашэнне наведаць Беларусь, а таксама за яе ініцыятыву па правядзенні канферэнцыі на тэму еўразійскай бяспекі. Гэта, па словах міністра замежных спраў Расійскай Федэрацыі, цяпер актуальна як ніколі. «Калі Богам і гісторыяй дадзены нам адзіны, вялізны, самы буйны кантынент, самы багаты па прыродных рэсурсах, Еўропа пад дыктоўку амерыканцаў вырашыла разваліць на два лагеры, як гэта было ў савецкую эпоху, у эпоху «халоднай вайны», — патлумачыў кіраўнік знешнепалітычнага ведамства Расіі актуальнасць канферэнцыі. — Але і тады эканамічныя сувязі не перарываліся. А цяпер пад націскам Вашынгтона Еўропа ідзе на прамыя страты. Думаю, гэта была таксама адна з задач у амерыканцаў — аслабіць Еўропу, не даць ёй магчымасці эканамічна расправіць плечы і стаць самастойнай».

### «НАМ ГЭТА ВАЙНА НЕ ПАТРЭБНА, ЯК І ВАМ»

**У ходзе перагавораў з міністрам замежных спраў і знешняга гандлю Венгрыі Петэрам Сійярта кіраўнік дзяржавы адзначыў, што яму прыемна сустракацца з дыпламатам. «Вы, напэўна, самы медыйны міністр замежных спраў цяпер, асабліва на нашай прасторы, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да госця Палаца Незалежнасці. — Мы вас часта бачым, шмат чуем. Не толькі вашы выказванні, але і нашага добрага сябра, спадара Орбана (прэм'ер-міністра Венгрыі. — «Зв.»)».**

Па словах кіраўніка дзяржавы, чамусьці ў Еўрасаюзе лічаць, што Беларусь з'яўляецца праціўнікам Еўрапейскага саюза. «Ведаеце, мы людзі не злапамятныя, і, нягледзячы на цяперашнюю турбулентнасць у Еўрасаюзе і санкцыі, якія Еўрасаюз уводзіць супраць нас, вы павінны ведаць, што Прэзідэнт Беларусі з'яўляецца гарачым прыхільнікам захавання Еўрапейскага саюза, — заўважыў ён. — Не таму, што я вельмі люблю Еўрапейскі саюз, а таму, што Еўрапейскі саюз разам з ЗША, Кітаем, Расіяй і Індыяй у пэўнай ступені з'яўляюцца моцнымі апорамі нашага існавання, нашай планеты. І калі гэтую апору вырваць з-пад гэтай сістэмы, будзе вельмі дрэнна для ўсіх. Таму, як еўрапейская дзяржава (а цэнтр геаграфічны ў нашым Полацку, на поўначы Беларусі), мы абсалютна за тое, каб Еўрапейскі саюз існаваў».

Кажучы аб супадзенні беларускай і венгерскай пазіцый, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што мы вельмі хочам, каб Еўрапейскі саюз быў магутным, моцным, суверэнным і незалежным аб'яднаннем. «Мы на гэта накіраваны, і вы гэта павінны ведаць, — звярнуў увагу ён. — Пры ўсіх нюансах у адносінах і нават той палітыкі, якую сёння саюз праводзіць у адносінах да Беларусі, мы прыхільнікі саюза».

Прэзідэнт расказаў, што Беларусь, нягледзячы на некаторыя праблемы, пераадолела санкцыі. Цяпер варта засяродзіцца на пытанні міру ў рэгіёне. «Проста насцярожвае тое, што мы можам разбурыць нават тую дрэнную, як мы яе крытыкуем, сістэму светапарадку, якая сёння існуе, — патлумачыў Аляксандр Лукашэнка. — І мы ўсё больш і больш робім крокі (паверце, я ўжо вопытны палітык, я гэта бачу, займаюся гэтым сур'ёзна) да поўнамаштабнай вайны з прымяненнем самай смертаноснай зброі. Тое, што амерыканцы там пастаўляюць ATACMS, ракеты гэтыя, украінцам, павінны разумець, што яны эскалацыю ажыццяўляюць у гэтай вайне. Расія з гэтым ніколі не змірыцца, ды і мы ў тым ліку. Таму нам трэба ўсяляк гэтаму супрацьстаяць, калі не хочам, каб ізноў апынуліся ў гэтым гарачым катле — не супрацьдзеяння, а страшнай смертаноснай вайны».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што пазіцыя Беларусі па Украіне прыкладна такая ж, як і ў Венгрыі. «Нам гэтая вайна не патрэбна, як і вам, — дадаў ён. — Мы (з Украінай. — **«Зв.»**) — суседзі. Гэта ў нашым доме ідзе вайна. Многае, вядома, залежала б ад Еўрапейскага саюза, хоць, я разумею, ціск з-за акіяна ажыццяўляецца магутны». Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка абсалютна перакананы: калі б еўрапейцы захацелі, можна было б скончыць гэтую вайну і дамовіцца. Пасля чаго зрабіць пэўныя высновы, каб гэтага больш не адбылося.

Кажучы аб гандлёва-эканамічных адносінах паміж Беларуссю і Венгрыяй, Прэзідэнт з жалем адзначыў, што яны дэградуюць. «Не па нашай віне, вы ведаеце, у чым прычына, — удакладніў кіраўнік дзяржавы. — Калі ў венграў, кіраўніцтва Венгрыі, будуць пэўныя пажаданні працаваць у Беларусі, мы з задавальненнем

У тэму

Сяргей ЛАЎРОЎ:

## «РАСІЙСКІ БОК НЕ АДМАЎЛЯЕЦЦА АД ПЕРАГАВОРАЎ ПА УКРАІНЕ»

Як заўважыў у размове з прадстаўнікамі сродкаў масавай інфармацыі міністр замежных спраў Расіі Сяргей ЛАЎРОЎ, аб'яднанне намаганняў па захаванні міру з'яўляецца абавязковым для ўсіх нармальных краін. Таму міжнародная канферэнцыя, якая праходзіць у Мінску, па яго словах, вельмі актуальная і своечасовая.

«Калі нашы заходнія калегі, якія займаюць каля чвэрці заходняй Еўразіі, лічаць, што ў іх інтарэсах аддаваць усе свае грошы на ўзбраенне кіеўскага рэжыму і несці каласальныя эканамічныя страты, падвяргаючыся дэіндустрыялізацыі і выпускаючы Злучаныя Штаты ў абсалютныя лідары, страчваючы больш за ўсё ад вайны ва Украіне; калі яны лічаць гэта галоўным для сябе, то мы тут нічога зрабіць не можам, — адзначыў кіраўнік расійскага знешнепалітычнага ведамства. — Але гэта не значыць, што ўсе астатнія павінны чакаць, пакуль возьме верх розум. Таму мы прасоўваем еўразійскае супрацоўніцтва даўно, у розных фарматах».

Сяргей Лаўроў падкрэсліў, што расійскі бок не адмаўляецца ад перагавораў па Украіне. Аднак расслабляцца, па яго словах, не варта.

«І перад тварам вайны, якую яны нам аб'явілі, не дазволіць нанесці нам паражэнне, — удакладніў міністр. — У іх мэта аб'яўлена — стратэгічнае паражэнне Расіі на полі бою. Пры гэтым перыядычна абвінавачваюць нас у тым, што мы адыходзім ад перагавораў. Ад перагавораў мы не адыходзілі. Зусім нядаўна былы Федэральны канцлер Германіі Герхард Шродэр даў вялікае інтэрв'ю, у якім расказаў, як рыхтаваўся дакумент яшчэ ў сакавіку — красавіку 2022 года, які дазволіў бы завяршыць ваеннае супрацьстаянне на аснове гарантый бяспекі як Расіі, так і Украіны. Там таксама меркаваліся гарантыі неўключэння Украіны ў НАТА. Кіеўскі рэжым, напэўна, рэалістычна ўсведамляючы перспектывы працягу баявых дзеянняў, быў гатовы гэты дакумент падпісаць. Ім забаранілі з Вашынгтона і з Лондана».

Пётэр СІЙЯРТА:

## «МЫ, ВЕНГРЫ, ЖАДАЕМ МІРУ»

Міністр замежных спраў і знешняга гандлю Венгрыі Петэр СІЙЯРТА распавёў, што Венгрыя, якая знаходзіцца па суседстве з Украінай, кожны дзень сутыкаецца з драматычнымі наступствамі вайны. «Венгрыя ўжо прыняла больш як мільён бежанцаў, і ўся краіна плаціць вялікую цану за гэтую вайну, — адзначыў ён. — На тэрыторыі Украіны, дзе традыцыйна пражываюць венгры па нацыянальнасці, яны пакутуюць і гінуць у выніку ваеннага канфлікту, які разгараўся. Мы не хочам, каб людзі памыралі ў гэтай вайне: ні венгры, ні любыя іншыя прадстаўнікі. Мы не хочам, каб былі далейшыя разбурэнні».

«Трэба скончыць вайну, — падкрэсліў ён. — Мы, венгры, жадаем міру і ведаем, што да міру прывядуць мірныя перагаворы. Мы выдатна ведаем, што бяспека будзе дасягнута ў тым выпадку, калі мы зноў зможам сесці за стол перагавораў і бяспечна перагаварыць адзін з адным».

Петэр Сійярта падкрэсліў, што высока цэніць тое, што ў Мінску была магчымасць пагаварыць аб пытаннях бяспекі і еўразійскім супрацоўніцтве. «Я шчыра спадзяюся на тое, што настане час, калі еўразійскае супрацоўніцтва зноў стане рэальнасцю», — канстатаваў ён.

прымем вашы прадпрыемствы, кампаніі — створым самыя выгадныя ўмовы для работы».

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў венгерскаму кіраўніцтву за падтрымку беларускіх спартсменаў. «За тое, што нашы футбалісты, спартсмены маюць магчымасць у Венгрыі быць як дома, праводзіць свае хатнія матчы, — канкрэтызаваў ён. — Як бачыце, выхад знаходзім. Ціснуць на спартсменаў, асабліва на паралімпійцаў, інвалідаў, — гэта ўвогуле жахліва. Добра, што ў Венгрыі гэта разумеюць».

У завяршэнні сустрэчы Прэзідэнт яшчэ раз паўтарыў, што Беларусь адкрытая для ўзаемадзеяння з Венгрыяй. «Мы — людзі ўдзячныя, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. — Думаю, прыйдзе час, калі мы з вамі зможам па вялікім рахунку разлічыцца за вашу добрую палітыку ў адносінах да Беларусі».

Аляксандр Лукашэнка перадаў прэм'ер-міністру Венгрыі Віктару Орбану самыя найлепшыя пажаданні. «Нам туды прыехаць складана, амаль немагчыма цяпер, а вось ён можа ў любы час прыляцець, пагаворым па сур'ёзных пытаннях, — зрабіў цікавую прапанову беларускі лідар. — Думаю, гэта будзе карысна».

У сваю чаргу, Петэр Сійярта падзякаваў Прэзідэнту за магчымасць сустрэцца. «Я веру ў дыялог, — адзначыў кіраўнік знешнепалітычнага ведамства Венгрыі. — Мы хочам, каб у нас па суседстве быў мір. Па суседстве ідзе такая вайна, за якую мы ніяк не адказваем, але мы плацім цану за яе. У гэтай вайне паміраюць і венгры. Мы хацелі б, каб гэтая вайна як мага хутчэй скончылася. Таму мы паспешваем перамір'е і спыненне агню. Я шчыра спадзяюся, што хутчэй раней, чым пазней, гэта ўсё і наступіць, будзе створана магчымасць для гэтага. Мы ведаем, што без дыялогу, зносін гэта ніколі не стане магчымым. Перакрыццё каналаў зносін з'яўляецца адмовай ад надзеі на мір».

**Вераніка КАНЮТА.**

# Ад прагнозаў да рэалізацыі

### Комплексны прагноз як падмурак сістэмнай работы

Менавіта Комплексны прагноз навукова-тэхнічнага прагрэсу павінен стаць адным са сродкаў устаранення недахопаў. Сяргей Шлычкоў адзначыў, што Комплексны прагноз з'яўляецца дакументам стратэгічнага планавання сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай краіны на сярэднетэрміновы, пяцігадовы, перыяд і на доўгатэрміновы, да 2045 года. Комплексны прагноз дае магчымасць вызначыць найбольш перспектыўныя кірункі дзейнасці ў эканоміцы.

Цяперашні дакумент у адрозненне ад папярэдняга ахоплівае ўжо 15 галін эканомікі, якія фарміруюць аснову ўнутранага валавога прадукту краіны, і закранае 22 віды эканамічнай дзейнасці. Такое дзяленне дазваляе максімальна сінхранізаваць прагноз з дакументамі сацыяльна-эканамічнага планавання, якія распрацоўвае Міністэрства эканомікі. Дарэчы, статыстыка сведчыць, што практычна ва ўсіх галінах, для якіх распрацоўваўся папярэдні Прагноз, ад 25 % да 65 % аб'ектаў прагназавання былі ўключаны ў галіновыя планы развіцця.

### Як гэта працуе?

Аб тым, як праходзіла работа над Прагнозам, расказала Наталля Паўлава. Яна адзначыла, што над праектам працавала больш за 150 спецыялістаў. Прычым у складах экспертных саветаў прысутнічалі як прадстаўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, так і бізнесу.

Дзякуючы такому парытэту, удалося вызначыць найбольш перспектыўныя кірункі. На першым этапе экспертамі быў складзены пералік аб'ектаў прагназавання. Да іх адносяцца перспектыўныя інавацыйныя тэхналогіі, тавары і паслугі, якія забяспечаць канкурэнтныя перавагі нашай краіне. Асаблівасцю гэтага пераліку стала тое, што ён быў узгоднены з усімі зацікаўленымі бакамі. Іншымі словамі, на этапе яго фарміравання буйныя прадпрыемствы, ведамствы ўнеслі свае заўвагі і прапановы, што, безумоўна, паспрыяла найбольшай дакладнасці пераліку.

Другі этап — непасрэдна прагназаванне. Для кожнага аб'екта прагназавання прызначаліся пэўныя значэнні, якія фарміраваліся з некалькіх параметраў. Гэта трэнды сусветнай эканомікі, ёмістасць рынку, а таксама наяўнасць інфраструктуры для рэалізацыі праекта. На падставе гэтых значэнняў аб'ектам прагназавання прысвойваўся індэкс перспектыўнасці, а ў канчатковым выніку быў складзены рэйтынг найбольш перспектыўных і эфектыўных праектаў (навукова-даследчых і вопытна-канструктарскіх работ, інавацыйных, інвестыцыйных праектаў). Ён аб'ядnaў праекты для сярэдне- і доўгатэрміновага прагнозаў. У першы прагноз увайшло 365 аб'ектаў, у другі — больш за 400.

Акрамя таго, усе аб'екты падзелены на тры катэгорыі ў залежнасці ад ступені распрацоўкі. Першая катэгорыя — аб'екты, якія ўжо гэтую пяцігодку (маюцца на ўвазе 2026—2030 гады) можна пакласці ў аснову бізнес-плана і пачынаць вытворчасць. Другая катэгорыя аб'ядноўвае доследныя і эксперыментальныя ўзоры. Дзеля рэалізацыі такіх праектаў патрэбна пэўная падрыхтоўка. Напрыклад, падбор і падрыхтоўка кадраў або стварэнне адпаведнай інфраструктуры. Да трэцяй катэгорыі аднесены аб'екты ўзроўню ідэі і канцэпцыі, што патрабуюць дасканалай распрацоўкі.

У сваю чаргу, Сяргей Шлычкоў дадаў, што яшчэ адзін значны вынік Комплекснага прагнозу — гэта адзіная сістэма прыярытэтаў навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці. На сёння вызначана сем прыярытэтаў. Найбольш важкі з іх — інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі. Менавіта гэты кірунак дае найбуйнейшы эканамічны эфект. Сярод іншых прыярытэтаў старшыня ДКНТ назваў машынабудаванне, металургію, электроніку і прыборабудаванне; медыцыну, фармакалогію і медыцынскія біятэхналогіі; энергетыку, будаўнічыя тэхналогіі, матэрыялы з зададзенымі якасцямі...

### Космас — наперадзе

Між іншым, пытанні журналістаў закранулі не толькі непасрэдна тэму прэс-канферэнцыі. Так, даволі цікавым было пытанне наконт навукова-тэхнічнай кааперацыі з Расійскай Федэрацыяй. Сяргей Шлычкоў адзначыў, што ў гэтым кірунку работа ідзе ў рамках праектаў і праграм Саюзнай дзяржавы. На сёння ўжо завершана больш за 60 сумесных праграм. Большасць з іх — у сферы сумеснага выкарыстання касмічнай прасторы. Дзякуючы іх рэалізацыі, сёння ў космасе дзейнічае сумесная групоўка касмічных апаратаў па дыстанцыйным зандзіраванні зямлі.

Старшыня ДКНТ расказаў і пра стратэгічныя праекты, якія сёння рэалізоўваюцца. Ён адзначыў, што агульная колькасць стратэгічных праектаў — 30—35. Сярод іх — такія агульнавядомыя, як будаўніцтва Бел-АЭС, стварэнне БНБК, маштабная мадэрнізацыя дрэваапрацоўчай галіны. Што датычыцца тых, якія сёння ў стадыі рэалізацыі, то тут Сяргей Шлычкоў вызначыў развіццё нацыянальнага электратранспарту. Прычым ён звярнуў увагу не столькі на выраб электробусаў, якія карыстаюцца попытам за межамі нашай краіны, колькі на стварэнні ўласных камплектуючых для іх вытворчасці.

Ён таксама выказаў упэўненасць, што Савет па стратэгічных інвестпраектах, які неўзабаве будзе створаны, дасць новы імпульс для іх развіцця.

**Уладзімір ВЯРЭНІЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Будзь у курсе!

## 100 ДАДАТКОВЫХ ЦЯГНІКОЎ НА ЛІСТАПАДАЎСКІЯ СВЯТЫ

**З улікам павелічэння пасажырапатоку ў перыяд з 2 да 8 лістапада Беларуская чыгунка прызначыла 100 дадатковых цягнікоў у міжрэгіянальных і міжнародных зносінах. Пра гэта інфармуе прэс-цэнтр БЧ.**

У міжрэгіянальных зносінах прызначана 80 дадатковых цягнікоў, якія будуць курсіраваць па найбольш запатрабаваных у пасажыраў маршрутах: Мінск — Гомель, Мінск — Брэст, Мінск — Віцебск, Мінск — Гродна, Мінск — Магілёў, Мінск — Пінск, Мінск — Камунары, Брэст — Гомель, Віцебск — Орша — Гродна, Гродна — Орша — Крычаў.

У міжнародных зносінах з Расійскай Федэрацыяй Беларуская чыгунка ва ўзаемадзеянні з ААТ «Расійскія чыгункі» прызначана 20 дадатковых паяздоў па маршрутах Мінск — Санкт-Пецярбург, Брэст/Віцебск — Масква, Масква — Брэст, Санкт-Пецярбург — Смаленск і Калінінград — Масква.

Напрыклад, на маршруце Мінск — Санкт-Пецярбург 2, 3, 4, 6 лістапада дадаткова прызначаны цягнік № 250 Мінск — Санкт-Пецярбург адпраўленнем з Мінска ў 19.03 і прыбыццём у Санкт-Пецярбург ў 8.53 наступнага дня. У зваротным напрамку 3, 4, 5, 7 лістапада прызначаны цягнік № 249 Санкт-Пецярбург — Мінск адпраўленнем з Санкт-Пецярбурга ў 20.13 і прыбыццём у сталіцу нашай краіны на наступныя суткі ў 10.20. У дарозе на тэрыторыі Беларусі гэтыя цягнікі будуць рабіць прыпынкі ў Жодзіне, Барысаве, Крупках, Талачыне, Оршы і Віцебску.

На маршруце Брэст — Масква 6 лістапада прызначаны цягнік № 236 Брэст — Масква адпраўленнем з Брэста ў 13.12 і прыбыццём у Маскву 7 лістапада ў 5.54 з прыпынкамі на тэрыторыі нашай краіны ў Жабінцы, Бярозе, Івацэвічах, Баранавічах, Мінску, Жодзіне, Барысаве, Талачыне і Оршы. У зваротным напрамку 7 лістапада назначаны цягнік № 231 Масква — Брэст, які адправіцца з Масквы ў 18.18 і прыбудзе ў Брэст 8 лістапада ў 9.13, з прыпынкамі на тэрыторыі нашай краіны ў Оршы, Барысаве, Мінску, Баранавічах, Івацэвічах, Бярозе і Жабінцы.

Акрамя таго, у складзе гэтых цягнікоў будуць курсіраваць беспераcадачныя вагоны на маршруце Віцебск — Масква — Віцебск адпраўленнем: з Віцебска 6 лістапада ў 18.07 і прыбыццём у Маскву 7 лістапада ў 5.54; з Масквы 7 лістапада ў 18.18 і прыбыццём у Віцебск 8 лістапада ў 5.02.

3 лістапада прызначаны цягнік № 295 на маршруце Масква — Брэст адпраўленнем з Масквы ў 23.14 і прыбыццём у Брэст 4 лістапада ў 14.10. 6 лістапада прызначаны цягнік № 296 Брэст — Масква, які адправіцца з Брэста ў 0.18 і прыбудзе ў Маскву ў гэтыя ж суткі ў 16.07. Гэтыя цягнікі на тэрыторыі нашай краіны будуць рабіць прыпынкі ў Оршы, Барысаве, Мінску і Баранавічах.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Далучайцеся!

## УСІХ АХВОТНЫХ ЗАПРАШАЮЦЬ ДА ЎДЗЕЛУ Ў АДЗІНЫМ ДНІ АЗЕЛЯНЕННЯ

**У гэтую суботу, 28 кастрычніка, Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя праводзе ў Беларусі адзіны дзень азелянення — мерапрыемствы па пасадцы драўняна-хмызняковай раслліннасці пройдуць ва ўсіх рэгіёнах краіны.**

У рамках Года міру і стваральнай працы ведамствам абвешчана экалагічная кампанія «Мірная стваральная праца на карысць чыстай і зялёнай краіны!».

У ходзе адзінага дня азелянення плануецца высадзіць больш як 60 тысяч саджанцаў драўняна-хмызняковай расліннасці: ліп, клёнаў, дубоў, рабін, грабаў, соснаў, вербаў, арэхаў, каштанаў, ясеняў, бэзу, спірэі, туі, фарзіцый і іншых. Мінпрыроды запрашае кожнага жыхара і госця Беларусі прыняць актыўны ўдзел у мерапрыемствах адзінага дня азелянення і тым самым унесці свой уклад у агульную вялікую справу — захаванне прыроды роднага краю.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ВОПЫТ, МУДРАСЦЬ + МАЛАДОСЦЬ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

— Тое, што юбілей камсамола адзначаецца на такім высокім узроўні, — асабістая заслуга кіраўніцтва нашай краіны, — падкрэслівае **першы сакратар ЦК БРСМ Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ.** — З нагоды свята — нямала мерапрыемстваў, якія праходзяць на гэтым тыдні ва ўстановах адукацыі і на прадпрыемствах. Гэта важна, таму што трэба развівацца на трывалым падмурку, найперш гістарычным. Толькі праз павагу да нашага мінулага можна выбудоўваць будучыню.

Адным з ганаровых гасцей стаў **Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь Пётр МІКЛАШЭВІЧ.**

— З поўным правам магу аднесці сябе да ветэранаў камсамола, — падкрэсліў ён. — У далёкім 1970 годзе я атрымаў камсамольскі білет у Вілейскім райкаме камсамола. Затым дзесяць гадоў праходзіў службу ў радах Узброеных сіл: у групе савецкіх войскаў у Магдэбургу на Эльбе, у Краснаярску — на беразе Енісея. Актыўна ўдзельнічаў у камсамольскім жыцці. Лёс трывала звязаў мяне з камсамолам, і гэта дзейнасць дала мне найбагацейшы жыццёвы вопыт для далейшай маёй прафесійнай дзейнасці. Я сардэчна віншую ўсіх членаў БРСМ са знакавымі юбілейнымі датамі — 105-годдзем УЛКСМ і 60-годдзем студатрадаўскага руху ў Беларусі. Ідэйным падмуркам камсамольскага руху былі любоў да Радзімы, сумленная праца на карысць грамадства, адзінства, сяброўства, узаемавыручка, захаванне маральных каштоўнасцяў, імкненне да справядлівасці.



Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі на сучасным этапе, захоўваючы найлепшыя традыцыі камсамола, садзейнічае фарміраванню грамадзянскай свядомасці і патрыятычнаму выхаванню маладых людзей. У абноўленай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь вызначаны асновы канструктыўнага ўзаемадзеяння дзяржавы і моладзі. Дарэчы, у падрыхтоўцы змяненняў у Асноўны Закон краіны моладзь прымала самы актыўны ўдзел...



— Камсамол заўсёды жыў інтарэсамі краіны. І без удзелу камсамольцаў, а іх было ў рэспубліцы 1,5 мільёна чалавек, не было здзейснена ніводнай вялікай справы, — падзяліўся ўспамінамі **старшыня савета ветэранаў камсамола, піянерскага і маладзёжнага руху пры Цэнтральным камітэце БРСМ, першы сакратар ЦК Ленінскага камуністычнага саюза моладзі Беларусі ў 1990—1991 гадах Аляксей КРЫЎДЗЕНКА.** — Камсамол быў пляцоўкай, куды малады чалавек мог прыйсці са сваімі праблемамі, думкамі, дасягненнямі, планамі, і нашай галоўнай задачай было дапамагчы яму трывала стаць на ногі, развіць свае здольнасці, каб ён мог плённа працаваць на карысць Радзімы.

У 80-я гады XX стагоддзя распачаліся дыскусіі, а ці патрэбная маладзёжная арганізацыя наогул, згадаў ветэран руху. Некаторыя маладыя людзі выходзілі з яе. Але вопыт паказаў, што, калі чалавек трапіў у камсамол і праявіў сябе там, гэта ў будучыні вельмі яму дапаможа.

«Калісьці пафасна казалі, што ў жыцці заўсёды ёсць месца подзвігу. Але подзвіг — гэта неабавязкова кагосьці выратаваць, а, напрыклад, добра вучыцца, займацца актыўнай грамадскай дзейнасцю, удзельнічаць у валанцёрскім руху, — лічыць Аляксей Крыўдзенка. — Дзейнічаць аднаму заўсёды складана, а калі вас шмат, калі ў вас ёсць план, стратэгія, можаце дасягнуць значна большага. Сёння БРСМ аб'ядноўвае амаль 400 тысяч чалавек. Гэта, напэўна, самая вялікая маладзёжная арганізацыя на постсавецкай прасторы. І мне вельмі прыемна, што многія формы работы БРСМ падхапіў у камсамола...»

**Таццяна ШПАКАВА, загадчык аддзела ЦК ЛКСМБ,** канстатуе: «Усё маё жыццё было звязана з камсамолам. Я і сёння штодня цікаўлюся, чым займаецца БРСМ, радуюся за іх поспехі. Як толькі ўступіла ў камсамол, мяне ўвесь час кудысьці выбіралі (*смяецца*). Я была дэлегатам чатырох з'ездаў камсамола Беларусі, XIV з'езда УЛКСМ. Шмат успамінаў звязана з Наваполацкам. Гэты горад сваім узнікненнем абавязаны менавіта камсамольцам. У гістарычным музеі горада ёсць нават асобная экспазіцыя, прысвечаная ім...»

Трэба патлумачыць, што ў лютым 1958 года, на XX з'ездзе камсамола Беларусі, узвядзенне Полацкага нафтаперапрацоўчага завода было аб'яўлена Усесаюзнай ударнай камсамольскай будоўляй. А ў чэрвені таго ж года на левым беразе Заходняй Дзвіны высадзіўся першы атрад маладых будаўнікоў.

«Камсамольцы працавалі так, быццам яны самыя галоўныя гаспадары на гэтай будоўлі. Моладзь прыязджала з усіх рэспублік Савецкага Саюза, — расказвае Таццяна Шпакава. — Таму Наваполацк — вельмі інтэрнацыянальны горад. Маладыя працавалі і стваралі тут свае сем'і. Трэба сказаць, што камсамольцаў падтрымлівала кіраўніцтва горада, партыйнае кіраўніцтва, нам давалі права і магчымасць быць ініцыятарамі вельмі многіх важных спраў. А пазней, калі ў Наваполацку ствараўся гарком камсамола, мяне абралі яго першым сакратаром. Ніякіх спраў у горадзе не вырашалася без нашага ўдзелу, і я жадаю, каб і ў сучаснай Беларусі нічога не вырашалася без прыцягнення БРСМ».

У ЦК ЛКСМБ Таццяна Антрапаўна працавала загадчыцай сектара ўдарных камсамольскіх будоўляў. Пабывала на шматлікіх усесаюзных камсамольскіх будоўлях, адпраўляла камсамольцаў на будаўніцтва БАМа. Кажа, што ахвотных было ў пяць разоў больш, чым патрабавалася.

Яшчэ адна легендарная асоба — **Уладзімір ГРЫДЗЮШКА, сакратар Цэнтральнага камітэта ЛКСМБ, узначальваў рэспубліканскую піянерскую арганізацыю да 1993 года.** Грыдзюшка стаў апошнім старшынёй Цэнтральнага савета Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі ў савецкія гады.

— Я прайшоў усе прыступкі: ад старшыні піянерскай дружыны і сакратара камітэта камсамола ў школе да сакратара камітэта камсамола свайго інстытута. Быў камандзірам будатрада, узначальваў зводны беларускі будатрад. Прайшоў школу Афганістана, дзе быў дарадцам ЦК УЛКСМ. Мы дапамагалі ствараць у гэтай краіне сваю маладзёжную арганізацыю. Важна было не пераносіць штучна ўсё, што было ў нас, на чужую глебу, а абапірацца на мясцовы змест, традыцыі і менталітэт. Мы нічога свайго не насаджалі, — расказаў Уладзімір Грыдзюшка. — Калі вярнуўся ў Мінск, мяне абралі сакратаром ЦК ЛКСМБ, я займаўся праблемамі студэнцкіх атрадаў. Потым узначаліў рэспубліканскую піянерскую арганізацыю.

«У 1990 годзе адбылася важная падзея ў гісторыі беларускай піянерыі, — працягнуў выступоўца. — Наша піянерская арганізацыя, якая да гэтага з'яўлялася часткай камсамола, была ператворана ў самастойную грамадскую дзіцячую арганізацыю. Краіна змянялася, і стала зразумелым, што ранейшы лозунг «Піянер, да барацьбы за справу Камуністычнай партыі Савецкага Саюза будзь гатовы!» састарэў. На злёце, які праходзіў у «Зубраняці» з удзелам дарослых і дзяцей, а гэта больш за тысячу чалавек, быў прыняты новы статут піянерскай арганізацыі і ўпершыню ў гісторыі абраны старшыня. Ім стаў я. Там жа, у «Зубраняці», быў зацверджаны і новы лозунг, заснаваны на прызнанні гуманітарных каштоўнасцяў: «Піянер, да спраў на карысць Радзімы, да дабра і справядлівасці будзь гатовы! — Заўсёды гатовы!». Ён застаўся і ў цяперашніх піянераў. Лічу вельмі важным, што мы захавалі беларускую піянерыю, у якой распачалася новая старонка ў гісторыі...»

**Аляксандр НАХАЕНКА быў тым чалавекам, які стаяў каля вытокаў Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі і ўзначальваў яго ў 2002—2003 гадах.** Да 2002 года ў Беларусі дзейнічалі дзве маладзёжныя арганізацыі — Беларускі патрыятычны саюз моладзі і Беларускі саюз моладзі. На 38-м аб'яднаўчым з'ездзе было прынята рашэнне аб аб'яднанні шляхам зліцця дзвюх найбуйнейшых маладзёжных арганізацый Рэспублікі Беларусь у адзіную — грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

— Прызнаюся, я адчуваў вялікую адказнасць за працэс, калі ўзначальваў аргкамітэт па аб'яднанні дзвюх буйных арганізацый, у якіх ужо склаліся і свае традыцыі, і свае сувязі. Як расліна не можа існаваць без каранёў, так і любая сям'я ці арганізацыя — без гісторыі і традыцый, — падкрэслівае Аляксандр Нахаенка. — Новая самая масавая маладзёжная арганізацыя прыняла на сябе ўсю гістарычную адказнасць як правапераемнік камсамола. Ці правільным было тое наша рашэнне? Мяркую, правільным, таму што гісторыя БРСМ налічвае ўжо больш як 20 гадоў. У скарбонцы гэтай грамадскай арганізацыі вельмі шмат важных, карысных, яскравых рэалізаваных праектаў. Моладзь застаецца моладдзю ва ўсе часы. Гэта заўсёды імкненне да нечага добрага, вялікага і проста вар'яцкая энергетыка. Адзінае адрозненне — сучасныя маладыя людзі маюць доступ да вялікай колькасці крыніц інфармацыі. Магчыма, яны не заўсёды ўмеюць правільна яе аналізаваць. Але для гэтага і існуе сувязь пакаленняў, каб вопыт, традыцыі, мудрасць і маладосць маглі сфарміраваць рух у правільным кірунку....

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У выніку масавай стральбы ў амерыканскім штаце Мэн загінулі звыш 20 чалавек



Па меншай меры 22 чалавекі сталі ахвярамі масавай стральбы ў горадзе Льюістан, штат Мэн. Дзясяткі атрымалі раненні. Узброены мужчына адкрыў агонь у боўлінг-цэнтры і рэстаране ў розных частках горада, пасля чаго схаваўся. Стала вядома, што арганізаваў стральбу 40-гадовы Роберт Кард, які меў вопыт вайсковай службы і з'яўляўся інструктарам па агнястрэльнай зброі, удакладніў тэлеканал ABC News. Таксама ў мужчыны ёсць праблемы з псіхічным здароўем. Улетку ён два тыдні знаходзіўся ў псіхіятрычным шпіталі пасля пагроз зладзіць стральбу ва ўстанове Нацыянальнай гвардыі. Таксама паступіла інфармацыя, што аўтамабіль падазраванага быў знойдзены ў горадзе Лісбон. Жыхарам Льюістана і Лісбона было загадана не пакідаць сваіх дамоў. Як адзначае CNN, Льюістан з насельніцтвам звыш 38 тысяч чалавек раней лічыўся адным з самых бяспечных гарадоў ЗША. Гэтае крывавае здарэнне стала 565-м выпадкам масавай стральбы ў краіне з пачатку гэтага года.

### Расія і Кітай у Савеце бяспекі ААН наклалі вета на рэзалюцыю ЗША па сітуацыі ў Ізраілі



Прадстаўнікі Расіі і Кітая ў Савеце бяспекі ААН скарысталіся правам вета пры разглядзе рэзалюцыі ЗША па канфлікце на Блізкім Усходзе. Пра гэта паведаміла РІА «Новости». Праект рэзалюцыі па сітуацыі вакол Ізраіля і Палесціны напярэдадні быў распаўсюджаны ЗША ў Савеце бяспекі ААН. Адзначаецца, што акрамя Расіі і Кітая супраць ініцыятывы, якая не ўтрымлівала патрабаванні аб спыненні агню, таксама прагаласавалі ААЭ, устрымаліся Мазамбік і Бразілія. Крыху пазней была абвешчана інфармацыя, што расійская рэзалюцыя таксама не была прынята ў СБ ААН. Гэты дакумент прадугледжваў «неадкладнае і доўгатэрміновае» спыненне агню ў Сектары Газа ў гуманітарных мэтах і ўтрымліваў асуджэнне гвалту і ваенных дзеянняў супраць грамадзянскага насельніцтва.

### У Марока пратэстоўцы патрабуюць абяцанай надзвычайнай дапамогі пасля землетрасення



У Марока сотні пратэстоўцаў выйшлі на вуліцы горада Амізміз недалёка ад эпіцэнтра землетрасення, якое адбылося ў мінулым месяцы, з патрабаваннем даць абяцаную экстранную дапамогу, паведаміла Associated Press. Пратэст рушыў услед за праліўнымі дажджамі, што пагоршылі цяжкасці людзей, якія жывуць у палатках побач з руінамі ўласных дамоў. У выніку землетрасення, якое адбылося ў Марока 8 верасня, былі разбураны цэлыя кварталы. Тысячам людзей давялося шукаць часовага прытулку. У Амізмізе і найбліжэйшых вёсках мараканскай правінцыі Эль-Хаўз амаль кожны чалавек страціў члена сям'і.

# Прыклады для пераймання і захаплення

**Праект «Новыя людзі» тэлеканала «Беларусь 3» стаў прызёрам IX Фестывалю кіно і тэлефільмаў духоўна-маральнага зместу «Святы Уладзімір» у Севастопалі.**

Творчая скарбонка сацыякультурнага тэлеканала папоўнілася чарговай узнагародай: прыз II ступені ў намінацыі «Праваслаўныя тэлепраекты» атрымаў выпуск, прысвечаны маладому беларускаму разьбяру Івану Гірвелю, які па-майстарску стварае з дрэва абразы і іншыя прадметы царкоўнай атрыбутыкі.

«Цыкл «Новыя людзі» — гэта галоўным чынам расповед пра тое, што папярэднічае поспеху, гартуе характар на доўгім шляху пераадолення сябе, — расказвае аўтар і рэжысёр праекта, намеснік дырэктара «Беларусь 3» Надзея Габец. — Нашы героі — сапраўдныя маладыя таленты, лаўрэаты рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў, стыпендыяты спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Тэатр, музыка, харэаграфія, жывапіс, літаратура — яны арганічна развіваюцца ў розных кірунках, дабіліся і працягваюць дабівацца значных поспехаў. І таму адчуваеш гонар за магчымасць пазнаёміць не толькі беларусаў, але і замежных гледачоў з нашай таленавітай моладдзю».

Цыкл «Новыя людзі» ствараецца за кошт сродкаў мэтавага збору на вытворчасць нацыянальнага кантэнту і выходзіць у эфіры штотыдня. Архіў выпускаў праграмы заўсёды даступны на YouTube-канале «Беларусь 3».



# ШАШКІ

**(«Звязда»)** Выпуск № 203

21 кастрычніка ў турэцкай Аланьі пачаўся маладзёжны чэмпіянат свету па шашках-64 з залікам у розных узростах. У першы дзень адбылася бліскавічная праграма. Беларускія спартсмены выйгралі пяць медалёў. «Золата» — на рахунку Аляксандры Спірчнай (Д27) і Арцёма Ціханава (Ю20), «серабро» — у Веранікі Целяўной (Д9), «бронза» — ва Уладзіслава Валюка (Ю27) і Івана Невара (Ю9). Міжнародны гросмайстар Андрэй Валюк стаў сярэбраным прызёрам этапа Кубка свету «Турцыя-2023» у бліскавічнай праграме.

Сёння ў нашай рубрыцы дэбютуе Аляксандр Уласенка (Мінск), які даслаў сваю мініяцюру.

**№ 163**



**№ 163**
**Белыя простыя:** d2, h2, d4, c5, h6, a7(6)
**Чорныя простыя:** b2, f4, g5, d6, e7, h8 (6)

**№ 164** Ю. Мурадаў (Барысаў)
**Белыя простыя:** e1, g1, h2, a3, f4, h6 (6)
Чорныя простыя: d2, c3, d4, h4, d6, f6, d8, h8 (8)

**№ 165** Р. Шаяхметаў (Уфа)
**Белыя простыя:** b2, дамкі: c7, d8 (3)
**Чорныя простыя:** f2, c5, a7, дамка: e1 (4)

**№ 166** Г. Андрэеў (Латвія)
